УДК 378.4(476-25).096:94]:001.89(091)"19/20"

## НАВУКОВЫЯ ШКОЛЫ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

**А.Г. Каханоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; Kohanovsky@bsu.by*

У артыкуле дадзены рэтраспектыўны аналіз станаўлення гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта як навуковага цэнтра, яго ролі ў развіцці гістарычнай навукі ў Беларусі, фарміравання прыярытэтных кірункаў даследаванняў, навуковых традыцый і школ. Асноўны акцэнт зроблены на паказ сучаснага стану іх функцыянавання, ацэнку навукова-экспертнага патэнцыялу факультэта, развіцця падрыхтоўкі кадраў вышэйшай капліфікацыі.

***Ключавыя словы:*** БДУ; гістарычны факультэт; навуковыя школы; традыцыі вывучэння; гістарыграфія; падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

## НАУЧНЫЕ ШКОЛЫ ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БГУ: ТРАДИЦИИ И СОВРЕМЕННОСТЬ

**А.Г. Кохановский**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; Kohanovsky@bsu.by*

В статье дан ретроспективный анализ становления исторического факультета Белорусского государственного университета как научного центра, его роли в развитии исторической науки в Беларуси, формирования приоритетных направлений исследований, научных традиций и школ. Основной акцент сделан на показе современного состояния их функционирования, оценке научно-экспертного потенциала факультета, развитии подготовки кадров высшей квалификации.

***Ключевые слова:*** БГУ; исторический факультет; научные школы; традиции изучения; историография; подготовка кадров высшей квалификации.

## SCIENTIFIC SCHOOLS OF THE FACULTY OF HISTORY OF THE BSU: TRADITIONS AND MODERNITY

**A. Kakhanouski**

*Belarusian State University, 4, Nezavisimosti avenue, 220030, Minsk, Belarus; Kohanovsky@bsu.by*

The article examines in retrospect the formation of the Faculty of History of the Belarusian State University as a scientific center, its role in the development of historical science in Belarus, the determination of priority research areas, scholarly traditions and scientific schools. The author pays particular attention to current functioning of scientific schools, assessment the scientific and expert potential of the faculty and training of highly qualified specialists.

***Key words:*** the BSU; the Faculty of History; scientific schools; traditions of studying; historiography; training of highly qualified specialists.

Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта за 85 год сваёй дзейнасці назапасіў без перавелічэння найбольшы ў нашай краіне навуковы і экспертны патэнцыял практычна па ўсяму спектру гістарычных ведаў. На сёняшні дзень тут працуюць 9 кафедр (гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, гісторыі Расіі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, гісторыі новага і навейшага часу, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, крыніцазнаўства, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў), дзе сканцэнтраваны звыш 100 спецыялістаў рознага навукова-педагагічнага профілю – вядомыя ў нашай краіне і за яе межамі вучоныя-гісторыкі, медыявісты, антыказнаўцы, мастацтвазнаўцы, этнолагі, археолагі, архівісты, спецыялісты ў галіне дакументацыйнага забеспячэння кіравання і інш. У іх ліку 18 дактароў навук, прафесароў, каля 80 кандыдатаў навук, дацэнтаў. На факультэце сфарміраваліся навуковыя школы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, сацыяльнай гісторыі Беларусі, германістыцы, палітычнай гісторыі

славянскіх краін, гісторыі краін Бліжэйшага Ўсходу і Паўночнай Афрыкі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўству і інш. На факультэце дзейнічае буйнейшая ў Беларусі аспірантура па гістарычных навуках. Тут вядзецца падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз апірантуру і дактарантуру па спецыльнасцях: 07.00.02 – айчынная гісторыя, 07.00.03 – усеагульная гісторыя, 07.00.06 – археалогія, 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, антрапалогія, 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метадалогія гістарычнага даследавання, 23.00.04 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў, 25.05.02 – дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства. На сёняшні дзень на факультэце праходзяць падрыхтоўку каля 70 аспірантаў, 17 дактарантаў і саіскальнікаў. Прычым кожная шостая кандыдацкая дысертацыя, абароненая ў БДУ, падрыхтавана на факультэце, кожная трэццяя дысертацыя па гістарычных навуках у Беларусі - таксама на факультэце. За 2016–2018 гг. саіскальнікамі гістарычнага факультэта было абаронена 31 кандыдацкая, 3 доктарскія дысертацыі. У бліжэйшыя 2–3 гады выкладчыкі факультэта плануюць завяршыць падрыхтоўку 4–5 доктарскіх і 5–7 кандыдацкіх дысертацый.

Працяг навуковых традыцый, захаванне школ немагчыма без пераемнасці пакаленняў. Зварот да вопыту і навуковых здабыткаў страрэйшых пакаленняў аказвае неацэнны ўплыў на прафесійны рост маладых гісторыкаў. Арганізацыя навуковай працы на факультэце вызначаецца адсутнасцю дзялення на "дарослую" і "навуку для пачаткоўцаў". Неад'емнай часткай навучальнага працэсу на факультэце, падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з'яўляецца ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай працы. Яны прымаюць удзел ва ўсіх навуковых мерапрыемствах факультэта, нярэдка прыцягваюцца да выканання заданняў у межах дзяржаўных праграм, асобных НДР. Штогод выходзіць з друку 50–70 работ студэнтаў, апублікаваных у навуковых выданнях, матэрыялах навуковых канферэнцый і інш.

Гістарычнаму факультэту – 85 год, але традыцыі вывучэння мінулага маюць амаль стогадовы вопыт. Хацелася б яшчэ раз падкрэсліць, што менавіта з адкрыццём БДУ, працай яго першых прафесароў-гісторыкаў звязана інстуцыяналізацыя вывучэння гісторыі ў Беларусі, пачатак станаўлення ўласнабеларускай гістарычнай школы [4, с. 8–9, 12–13]. З іх дапамогай адбылося станаўленне падрыхтоўкі гісторыкаў у мінскім педагагічным інстытуце, пачынаў працу Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Падмурак гістарычнай навукі ў БДУ закладвалі прафесары У.І. Пічэта, У.М. Перцаў, М.М. Нікольскі, В.А. Жарынаў, Д.П. Канчалоўскі, У.М. Ігнатоўскі і інш. [15, с. 7] Першая лекцыя ў сценах універсітэта была прачытана менавіта па гісторыі.

Структура факультэта за ўвесь перыяд дзейнасці неаднаразова станавілася прадметам рэарганізацый. Змяняўся адпаведна і навукова-педадагагічны профіль кафедр. Напрыклад, з канца 50-х і да пачатку 90-х гг. XX ст. гістарычны кірунак факультэта быў прадстаўлены кафедрамі гісторыі БССР, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, гісторыі новага і навейшага часу, гісторыі СССР дасавецкага перыяду, гісторыі СССР эпохі сацыялізму, а з 1973 г. – археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 1992 г. у складзе факультэта з'явіліся дзве новыя структурныя адзінкі – кафедра міжнародных адносін, якая ў 1995 г. стала асновай стварэння факультэта міжнародных адносін, і кафедра крыніцазнаўства і музеязнаўства. Неаднаразова адбывалася перапрофілізацыя кафедр гісторыі СССР. У канечным выніку на іх аснове былі створаны кафедра гісторыі Расіі і кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. У 1994 г. кафедра гісторыі Беларусі была падзелена на дзве – гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў і гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Далейшыя змены былі звязаны з рэарганізацыяй у 2001 г., якая закранула тры кафедры. Была створана кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, якая стала выпускаючай для спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны". У сувязі з перадачай часткі спецыялістаў у склад новай структурнай адзінкі і адкрыццём спецыяльнасці "Дакументазнаўства" кафедра крыніцазнаўства атрымала сёняшнюю назву і абноўлены навукова-педагагічны профіль, звязаны з падрыхтоўкай архівістаў і дакументазнаўцаў. Змяніла назву на сучасную і адпаведна навукова-педадагічны профіль кафедра археалогіі і

спецыяльных гістарычных дысцыплін. У той жа час у склад кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ўвайшла ліквідаваная агульнаўніверсітэцкая кафедра айчыннай і сусветнай гісторыі.

Прыярытэтныя кірункі навуковых даследаванняў на факультэце традыцыйна з'яўляюцца пытанні вывучэння гісторыі беларускай дзяржаўнасці, падзей Вялікай Айчыннай вайны, сацыяльнай гісторыі Беларусі, археалогіі Беларусі, гісторыі Вялікага княства Літоўскага, этналогіі і традыцыйнай культуры Беларусі, новай і навейшай гісторыі славянскіх краін, крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, дакументазнаўства, архівазнаўства, археаграфіі, гісторыі антычнага хрысціянства, германістыкі, гісторыі краін Бліжэйшага Ўсходу і Паўночнай Афрыкі. У большасці сваёй праца па вызначаных кірунках мае заканамерны працяг у станаўленні навуковых школ, некаторыя з якіх узніклі ў першыя дзесяцігоддзі працы БДУ і факультэта. Пачатак германістыкі, вывучэння гісторыі міжнародных адносін на факультэце паклалі працы прафесароў Л.М. Шнеерсона, М.П. Палецікі, Р.М. Трухнова, Д.С. Клімоўскага. Іх традыцыя знайшла працяг у працы выкладчыкаў кафедры гісторыі новага і навейшага часу. Акрамя таго, тут пад кіраўніцтвам прафесара У.С. Кошалева плённа працуюць спецыялісты па гісторыі арабскага Ўсходу, краін Лацінскай Амерыкі і інш. Акадэмікі М.М. Нікольскі і У.М. Перцаў заклалі асновы вывучэння ў Беларусі антычнасці, антычнага хрысціянства і еўрапейскага сярэднявечча. Іх навуковая спадчына знайшла пераемнікаў сярод выкладчыкаў кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Пад кіраўніцтвам прафесара В.А. Фядосіка перыядычна праводзяцца Міжнародныя навуковыя канферэнцыі "Лістападаўскія сустрэчы", якія збіраюць спецыялістаў з многіх краін і прысвечаны акадэмікам-пачынальнікам. Гэта адзіная на сёняшні дзень даследчыцкая пляцоўка ў Рэспубліцы Беларусь для абмеркавання праблем старажытнай і сярэднявечнай гісторыі.

Праца першых прафесароў-гісторыкаў У.І. Пічэты, Д.І. Даўгялы і інш. з'яўляецца ў пэўным сэнсе арыенцірам для сёняшніх археографаў (М.Ф. Шумейка), крыніцазнаўцаў (С.М. Ходзін), спецыялістаў па інтэлектуальнай гісторыі і расіязнаўцаў (А.А. Яноўскі), славістыцы (А.П. Салькоў) і г.д. Не забытыя сёння на факультэце імёны прафесароў, якія фарміравалі і ўмацоўвалі на працягу дзесяцігоддзяў навуковы патэнцыял універсітэцкай гістарычнай навукі – І.В. Царук, А.П. Ігнаценкі, В.Н. Рабцэвіча, І.В. Аржахоўскага, В.У. Чапко, Ф.М. Нячая, Г.М. Ліўшыца, П.І. Зялінскага, У.Ф. Ладысева і інш.

На факультэце важнае месца займае распрацоўка пытанняў гісторыі Вялікага княства Літоўскага, што звязваецца з працай кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў і яе першым загадчыкам П.А. Лойкам. На сучасным этапе актывізавалася вывучэнне сацыяльнай гісторыі Беларусі, пытанняў, звязаных з трансфармацыйнымі зменамі ў беларускім грамадстве. Традыцыі даследавання, навуковая школа, трывалыя асновы якой былі закладзены У.І. Пічэтай, М.В. Доўнар-Запольскім, У.М. Ігнатоўскім і інш. знайшлі працяг, перш за ўсё, у працах выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. А.Г. Каханоўскім была створана канцэпцыя сацыяльнай дынамікі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на пачатковым этапе яго пераходу да індустрыяльнага ўзроўню развіцця, вылучаны адметныя рысы сацыяльных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, паказана іх нераўнамернасць, неаднолькавая ступень пранікнення ў розныя сферы жыцця [6; 7]. На аснове вялікага комплексу матэрыялаў В.С. Макарэвіч вызначыў працэс фарміравання і рэалізацыі ўладамі Расійскай імперыі палітыкі "разбору шляхты" у канцы XVIII – XIX ст., даў аналіз сацыяльна-прававога статуса дробнай шляхты, яе рэакцыі на палітыку "разбору" [9]. Сацыяльныя працэсы ў асяроддзі беларускага сялянства ў XIX – пачатку XX ст. сталі прадметам вывучэння Г.І. Маскевіч [11], фарміраванне прадпрымальніцтва ў Беларусі, з'ўленне адпаведнай субкультуры – А.В. Бурачонка [1; 2; 3], праваслаўнае духавенства Беларусі як саслоўна-прававая група – Н.В. Карповіч [5], дзейнасць земскіх начальнікаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. – Г.А. Стралені [12], гісторыя дзяцінства ў Беларусі XIX – пачатку XX ст. – І.В. Лебедзевай [8]. фарміраванне

беларускай дыяспары - А.М. Максімчыка [10], эвалюцыя саслоўнай групы ганаровых грамадзян у складзе насельніцтва Беларусі ў 30-х гг. XIX – пачатку XX ст. – Т.М. Шчэрбы [14] і г.д. У манаграфіі С.М. Ходзіна «Беларуская вёска у міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921-1939)» прадстаўлены новы канцэптуальны погляд на савецкую мадэрнізацыю Беларусі ў міжваенны час [13]. У аснову пакладзена аўтарская гіпотэза неабходнасці ўліку не толькі тэхналагічнай складаючай мадэрнізацыі, але і традыцый, якія склаліся ў выніку сацыяльных змен у грамадстве. В.І. Менькоўскі з’яўляецца адным з аўтараў манаграфіі, прысвечанай рэалізацыі ідэі сацыялістычнага горада ў СССР ў 20–30-х гг. мінулага стагоддзя, паказу адметных рыс савецкай урбанізацыі [16]. Сацыяльныя працэсы і грамадскае жыццё БССР у міжваенны перыяд у апошняе дзесяцігоддзе сталі прадметам дэталёвага аналізу А.А. Гужалоўскага. Складаныя дзяржаўна-палітычныя працэсы, звязаныя з утварэннем беларускай савецкай рэспублікі сталі сферай навуковых інтарэсаў П.І. Брыгадзіна. Тэма Вялікай Айчыннай вайны стала прадметам многіх прац У.К. Коршука, Г.А. Болсун, Г.С. Хадасевіч, К.І. Козака, М.Ф. Шумейкі і інш., а таксама дысертацыйных даследаванняў аспірантаў і магістарантаў.

Многія значныя навуковыя дасягненні сталі магчымымі пры непасрэдным удзеле студэнтаў. Яны штогод у межах вучэбных практык выязджаюць у археалагічныя і этнагарафічныя экспедыцыі. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў факультэта, але рукамі студэнтаў знойдзены многія ўнікальныя артэфакты, якія дазваляюць рабіць сур’ёзныя навуковыя высновы. Унікальны археалагічны помнік Кардон, вынікі даследавання якога ўвайшлі ў пералік топ-адкрыццяў НАН Беларусі, вывучаўся ў тым ліку выкладчыкамі і студэнтамі гістарычнага факультэта. Аднымі з найбольш фундаментальных, якія дазволілі ўнесці новае бачанне ў складаную навуковую праблему паходжання і ранняга рассялення старажытных славян, сталі знаходкі падчас архелагічных экспедыцый апошніх год пад кіраўніцтвам дацэнта В.Г. Беляўца ў вёсцы Яскавічы Салігорскага раёна. Тут упершыню атрыманы выразна датаваныя матэрыялы мяжы II/III – V ст., якія запаўняюць хрaналагічную лакуну ў развіцці насельніцтва кола культур Усходнееўрапейскай лясной зоны – паміж старажытнасцямі постзарубінецкага гарызонту (I – II ст.) і пражскай культуры фазы “0” (канец IV ст.). Фактычна атрымана падцвярджэнне гіпотэзы “Палескай белай плямы”, сфармуліраванай у 70 – 80-х гг. мінулага стагоддзя. У адпаведнасці з ёю, этнагенез раннегістарычных славян – носьбітаў пражскай культуры – адбываўся ў I – V ст. на тэрыторыі Палесся і прылеглых рэгіёнаў, адкуль яны рассяліліся па еўрапейскім кантыненце, даўшы пачатак большасці сярэднявечных славянскіх народаў. Выкладчыкамі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў пад кіраўніцтвам прафесара Т.А. Навагродскага разам са студэнтамі праведзены этнаграфічныя экспедыцыі ў многіх раёнах Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай абласцей. Сабраны ўнікальныя помнікі народнай творчасці, сведчанні, успаміны, якія сталі асновай публікуемых штогод навуковых справаздач, кніг аб народнай культуры розных рэгіёнаў Беларусі.

На гістарычным факультэце на сучасным этапе дынамічна развіваюцца навуковыя даследаванні, змяніліся прыярытэты і пашырылася іх тэматыка, абнавіўся метадалагічны інструментарый. Вельмі актыўна выкарыстоўваецца міждысцыплінарны падыход. Навуковую працу выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта вызначае высокая публікацыйная актыўнасць. За 2015–2019 гг. імі надрукавана каля 3000 навуковых работ, у тым ліку звыш 60 манаграфічных даследаванняў, 272 навучальныя дапаможнікі, агульным аб’ёмам 4215 друкаваных аркушаў. Штогод факультэт выступае арганізатарам і праводзіць у сярэднім 20–30 навуковых мерапрыемстваў рознага ўзроўню – міжнародныя навуковыя канферэнцыі, круглыя сталы, семінары і інш. Кожны год выкладчыкі факультэта выступаюць з дакладамі на канферэцыях, якія праводзяцца ў іншых навукова-педагагічных установах Беларусі і за яе межамі. Толькі ў 2019 г. па няпоўных звестках прынялі ўдзел у больш, чым 200 навуковых форумах і зрабілі сумарна звыш 600 дакладаў. Асабліва варта адзначыць істотны ўплыў на павышэнне выніковасці і актуальнасці даследаванняў удзел выкладчыкаў і навучэнцаў факультэта на працягу апошніх 15–20

год у выкананні заданняў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. У 2016–2020 гг. факультэт з’яўляецца адной з галаўных арганізацый выканання падпраграмы “Гісторыя і культура” у межах ДПНД “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства”.

У завяршэнне варта было б падкрэсліць, што вышэй абазначаны далёка няпоўны пералік навуковых здабыткаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта. Гістарычны факультэт сёння ўяўляе сабой вядучы ў нашай краіне навукова-педагагічны і экспертны цэнтр у галіне даследавання і выкладання гісторыі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, які здольны не толькі аператыўна і якасна вырашаць задачы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў і кадраў вышэйшай кваліфікацыі, але і праводзіць глыбокі рэтраспектыўны аналіз праблем ў сферы міжнародных адносін, рэгіянальнай бяспекі, маніторынга этнічных, культурна-палітычных працэсаў, задач забеспячэння інфармацыйнай бяспекі краіны і г.д. У сваёй працы калектыў факультэта мае трывалую аснову, якая немагчыма без асэнсавання ўласных вопыта і традыцый папярэдніх дзесяцігоддзяў, захавання навуковых школ. Але і выклікі часу, задачы, якія вымушана вырашаць наша краіна патрабуюць ад факультэта быць заўсёды ўважлівым да дынамікі рынку працы і паслуг.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бурачонак А. В. Бровар з адметнай гісторыяй : заснаванне і дзейнасць мінскага піваварнага завода Фрумкіных–Чапскага–Лекертаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. 2018. № 4. С. 44–53.
2. Бурачонак А. В. Распаўсюджванне асацыіраванага капіталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. 2017. № 2. С. 54–61.
3. Бурачонак А. В. Сацыяльны склад прамысловых прадпрымальнікаў Беларусі (канец XIX–пачатак XX ст.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2011. Вып. 6. С. 20–26.
4. Исторический факультет БГУ. 80 лет / сост.: А.А. Прохоров, О.А. Яновский, А.М. Назаренко; редкол.: С. Н. Ходин (отв. ред.) [идр.]. Минск: БГУ, 2014. 155 с.; ил.
5. Карповіч Н. В. Колькасць і склад хрысціянскага духавенства Беларусі паводле перапісу насельніцтва 1897 г. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2007. Вып. 2. С. 130–132.
6. Каханоўскі А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2012. Вып. 7. С. 80–91.
7. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861 – 1914 гг.) / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск : БДУ, 2013. 335 с.
8. Лебедзева І. В. Сацыяльна-эканамічнае становішча дзяцей Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: крыніцазнаўчы аспект // Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. статей / ГУО "РИВШ"; редкол.: В. А. Гайсёнок (пред.) [и др.]. Минск : РИВШ. 2019. Вып. 19, ч. 1. Исторические науки. С. 266–273.
9. Макарэвіч В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.) / В. С. Макарэвіч.–Мінск : БДУ, 2018.– 315 с.
10. Максимчик А. Н. Население белорусских земель на Северном Кавказе в XIX – начале XX в.: вопросы миграции, расселения и участия в социально-экономических, культурно-образовательных процессах региона // Кавказоведение: опыт, проблемы и перспективы. Мат-лы Всерос. науч. конф. с междунар. участием, посвященной 100-летию известного ученого-кавказоведа, профессора Валентины Павловны Невской / Отв. ред. П.И. Абайханова (Магаяева). Карачаевск: КЧГУ, 2019. С. 279–289.
11. Маскевіч Г. І. Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2010. 164 л.
12. Страленя А. А. Введение института земских начальников в Минской, Могилевской и Витебской губерниях (конец XIX - начало XX в.) // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. Мінск: БДУ, 2014. № 1. С. 10–14.

13. Ходзін С. М. Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939). Мінск: БДУ, 2014. 240 с.

14. Щерба Т. Н. К вопросу о предпосылках социокультурных изменений в белорусском обществе в XIX – начале XX вв. // Роль университетского образования и науки в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. Д. Король (пред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2019. С. 682-684.

15. Яноўскі А. А. Аб распачынанні гістарычнай адукацыі на Беларусі // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 65-годдзю заснавання гіст. фак. Белдзяржуніверсітэта, Мінск, 26 лістап. 1999 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; навук. рэд.: Ю.Л. Казакоў [і інш.]. – Мінск, 2000. – С. 5–27.

16. Meerovich M. G., Menkouski V. I., Zherebtsov I. L. "Socialist City": Idea and its Realization in the Soviet Union 1920’s and 1930’s. Banska Bystrica: Belianum, 2019. 154 p.

УДК 94(437)+ 94(476) ″2010-2019″

## ЧЕШСКО-БЕЛОРУССКИЕ АКАДЕМИЧЕСКИЕ СВЯЗИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ НА ПРИМЕРЕ СОТРУДНИЧЕСТВА ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БГУ И ФИЛОСОФСКОГО ФАКУЛЬТЕТА ЗАПАДНО-ЧЕШСКОГО УНИВЕРСИТЕТА (2010–2019 гг.)

**П. Лозовюк**

*Западно-чешский университет в г. Пльзень, ул. Седлачкова 15, 30614, г. Пльзень, Чешская республика, lozoviuk@ksa.zcu.cz*

Характеризуется позитивный опыт сотрудничества двух партнерских институций: исторического факультета БГУ и философского факультета Западно-чешского университета в г. Пльзень, представленного кафедрой антропологии, по организации научно-образовательных стажировок, проведению научных и студенческих конференций и реализации проекта академической мобильности Эразмус+.

***Ключевые слова:*** белорусско-чешские отношения; академическая мобильность.

## CZECH-BELARUSIAN ACADEMIC COLLABORATION. THE CASE OF COOPERATION BETWEEN FACULTY OF HISTORY OF BSU AND FACULTY OF ARTS OF THE UNIVERSITY OF WEST BOHEMIA (2010–2019)

**P. Lozoviuk**

*University of West Bohemia , Sedlachkova 15, 30614, Pilsen, Czech Republic, lozoviuk@ksa.zcu.cz*

The positive experience of cooperation between the two partner institutions of the Faculty of History of the Belarusian State University and the Faculty of Arts of the University of West Bohemia in Pilsen is characterized including the organized research and educational internships, conducting scientific and student conferences and implementing the Erasmus + academic mobility project.

***Key words:*** Belarusian-Czech relations; academic mobility.

Австрийский исследователь Фердинанд Нойрайтер, известный специалист в области белорусской литературы и друг белорусского народа, в начале 1980-х гг. отмечал, что заинтересованная общественность (в том числе в немецкоязычном пространстве) имеет очень мало информации о культурных реалиях Беларуси [1, с.17]. И хотя с той поры произошли значительные позитивные изменения, информированность европейских экспертов о белорусской истории и культуре остается весьма ограниченной. В этой связи действующее академическое сотрудничество между Белорусским государственным университетом и Западночешским университетом (ЗЧУ) в г. Пльзень является позитивным примером научно-образовательного обмена, соответствующим вызовам современных задач интернационализации высшего образования.

Кафедра антропологии философского факультета Западночешского университета в г. Пльзень активно развивает многосторонние академические контакты с профильными кафедрами и научными центрами в странах как входящих,